***Ларыса Рыжкова***

## ВОПЫТ СУПРАЦОЎНІЦТВА ЎЗОРНАГА АНСАМБЛЯ «КАЛЫХАНКА» З ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНЫМ КАЛЕКТЫВАМ ВЁСКІ АНАНЧЫЦЫ

«Что может быть прекраснее в любом деле, чем сочетание житейской мудрости, опыта и юношеской энергии, оптимизма, уверенности в будущем? Не есть ли это приближение к той гармонии, которую пытается отыскать человечество. Именно такое сочетание можно услышать в совместном пении уникальных коллективов: Ананчицкого фольклорно-этнографического хора и детских образцовых коллективов «Калыханка» и «Куманёк» из Михановичей Минского района» – адзначалі гледачы вынікі аднаго з першых узораў перайманння спадчыны вуснай традыцыі Беларусі, наладжанага ў педагагічных мэтах [1, с. 1]. Варта падкрэсліць, што ў гэтага выніку былі папярэднія этапы.

Кіраўнік узорнага фальклорнага ансамбля «Калыханка» і аўтар прапанаванага артыкула ўпершыню выехала ў фальклорную экспедыцыю ў Ананчыцы Салігорскага раёна ў васмідзесятых гадах мінулага стагоддзя. У 1985–1987 гадах, як метадыст па фальклору абласнога цэнтра народнай творчасці, а потым як загадчык аддзела фальклору Рэспубліканскага цэнтра творчасці, я запісвала ў Ананчыцах песні, казкі, апавяданні. Мясцовы ансамбль, створаны ў 1965 годдзе Вольгай Пажыган, на той час быў шырока вядомы ў рэспубліцы. У 1981 годзе вялікі вінілавы дыск з лепшымі песнямі вёскі Ананчыцы выдала маскоўская фірма «Мелодыя».

У 1989 годзе для ўдзелу ў фальклорным цыкле тэлепраграмы «Калыханка» я стварыла дзіцячы фальклорны ансамбль у мястэчку Міханавічы Мінскага раёна. Першыя песні, якія сталі слухаць і пераймаць з этнаграфічных аўдыёзапісаў міханавіцкія дзеці, былі зафіксаваны раней у вёсках Кайкава, Бардзілаўка, Астравы Міханавіцкага сельсавета. Разам з імі я выкарыстоўвала для развучвання запісы спявачак у вёсцы Ананчыцы [2, с. 280]. У 1993 годзе адбылася першая паездка міханавіцкіх дзяцей у Ананчыцы. Салігорская тэлестудыя «Салтэк» здымала сюжэт пра жніво. Ананчыцкія жанчыны, апранутыя ў народныя строі, ішлі з песнямі на поле, зажыналі першы сноп, рабілі перавясла, частаваліся на полі прынесеным з дому пачастункам. Мы знаходзіліся побач. Дзеці ўпершыню тыдзень назіралі жыццё этнаграфічнай вёскі, дзе цалкам захаваліся спевы, мова, побыт, народная вышыўка, абавязковыя адкрытасць і гасціннасць.

У 1996 годзе калектывы з Міханавіч і Ананчыц упершыню сумесна ўдзельнічалі ў фальклорным фестывалі на Украіне (г. Харкаў, фестываль «Покуць-96») і ў Польшчы (г. Кракаў, фестываль «Музыка утрацона»). Кожны ансамбль выступаў са сваёй праграмай, але ў аўтобусе, ў гатэлі, падчас экскурсій было шмат часу для агульных спеваў і танцаў. Дзеці навучыліся танчыць і акампаніраваць сабе «пад язык», па-ананчыцку, «Матлёт», «Какетку», «Нарэчаньку», «Курапет», «Людзвінку» [3, с. 1; 4, с. 3] і інш. Восенню 2001 года ў Слуцку адбыліся Мінскія абласныя Дажынкі. Спявачкі з Ананчыц і дзеці з Міханавіч павінны былі выступіць адным блокам як два гурты жнеяк (жанчын і дзяўчат). Для рэпетыцый «Калыханка» выехала ў Ананчыцы. Адбыўся канцэрт двух гуртоў у мясцовым Доме культуры. Начавалі дзеці ў хатах ананчыцкіх спявачак, бачылі іх побыт, звычкі, чулі размовы, аповеды, жарты. На наступны дзень адбыліся сумесныя выступленні ў Слуцку і ў вёсцы Квасынічы. Летам 2006 года ў Нясвіжы прайшоў Першы абласны фестываль «Фальклорная талака». Калектывы з Ананчыц і Міханавіч сустрэліся на ім як блізкія людзі. Атрымаўшы ад рэжысёра дазвол на сумесны выступ, у адным з канцэртаў на адкрытай пляцоўцы праспявалі некалькі вясельных песен.

У лістападзе 2008 года прайшоў канцэрт «Напярэдадні Піліпаўкі» ўзорнага фальклорнага ансамбля «Калыханка» ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. У канцэрце выступіў і ансамбль спявачак з вёскі Ананчыцы. Спявалі самі і спявалі з міханавіцкімі «навучэнцамі».

Калі разглядаць перыяд нашага супрацоўніцтва як педагагічны (этнамастацка-адукацыйны) эксперымент, трэба падвесці яго вынікі і адказаць на пытанні: «Чаму навучылі дзяўчат сустрэчы з аўтэнтычнымі выканаўцамі?» – і: «Чым уразілі?» Найперш тым, што народная песня, што гучыць з вуснаў яе носьбітаў, не вельмі падобна на той варыянт выканання, які яны кожны раз чулі ў сябе ў Міханавічах з магнітафона. Народная песня ва ўмовах натуральнага існавання, як рака, – у яе немагчыма ўвайсці двойчы. Гэтае назіранне адразу прымусіла ўпэўненых у сабе маладых спевакоў

прыцішыцца, прыслухацца і пачаць падчас сумеснага спявання суадносіць свае галасы з галасамі жанчын.

Ананчыцкія ж спявачкі заўважылі, што ролю падгалоска ў дзіцячым калектыве выконвае не адна спявачка, а 2-3. Мне прыйшлося тлумачыць ім, што гэта часовая мера, таму што ў адной 12-14-ці гадовай дзяўчыны не хопіць сілы духу, ўпэўненасці ў сабе, каб выконваць ролю падгалоска. Таму што ансамбль – гэта канва, а падгалосак – вышыўка. А для вольнай вышыўкі голасам патрэбна мець добры самастойны густ, варта мець за плячыма шматлікія дарослыя жыццёвыя перажыванні і ўражанні, якімі прыспела пара падзяліцца з грамадой. Таму на пачатку ў нас былі два унісоны. Адзін сапранавы, другі альтовы. Гэтыя унісоны прыгожа паміж сабою злучаліся. І ўсіх гэта задавальняла, а насцярожыла толькі ананчыцкіх спявачак.

Дзеці былі ўражаны тым, як ўпэўнена спяваюць ў Ананчыцах, як смела і нечакана там умеюць імправізаваць і дэманстраваць нейкія новыя красоты, якіх не было на касеце. Яны заўважылі, як значна змяняе песню прысутнасць новых спявачак. Раней выхаванцы «Калыханкі» не згаджаліся спяваць лірыку, партызанскія і калгасныя песні, рамансы пра каханне. Яны здаваліся ім несур'ёзнымі, карыкатурнымі. Пабываўшы ў Ананчыцах і пачуўшы такія творы ад жанчын, перажыўшых вайну, калгасныя часы, дзеці сталі па-іншаму ставіцца да гэтага рэпертуару. І ў Міханавічах загучалі песні «Помню в роще соловьиной я гуляла вечерком», «Вот и жито поспело: колосок в колосок», «Сидят в обнимку ветераны, немного выпили, не пьяны», «Пад зялёнаю пад дубінаю сядзеў галубец з галубінаю». Пачуўшы ад ананчыцкіх жанчын гэтыя тэксты, многія з каторых наіўныя і кічавыя, дзеці ўжо ніколі самі над імі не смяяліся. І не выклікалі смеху, выконваючы іх перад школьнікамі ў Міханавічах, ці перад студэнтамі-мастакамі ў Акадэміі мастацтваў. Пасля сустрэч у Ананчыцах, Аксана Зайко (цяпер Тарасава) з «Калыханкі» стала адшукваць у запісах кожнай песні новы голас і спяваць яго. Так «Калыханка» перайшла на трохгалоссе, а потым і на спевы з імправізацыяй.

Усе перайманні «Калыханка» рабіла амаль самастойна [5, с. 63]. Сваю ролю, як кіраўніка, я заўсёды бачыла ў стварэнні ўмоў, у якіх дзеці зробяць адкрыцці, здабудуць веды, набудуць якасці. Сустрэчы з аўтэнтычнымі спевакамі – гэта найлепшыя ўмовы для саморазвіцця і самараскрыцця юнага энтузіяста фальклору і аўтэнтычных спеваў.

Міханавіцкія дзеці і ананчыцкія жанчыны заўсёды імкнуліся адзін да аднога [6, с. 13; 7, с. 7]. Жанчыны паважалі ў дзецях іх шчырую зацікаўленасць народнай культурай; таксама іх вабіла і кранала, наводзіла сум, свежасць маладых галасоў: «Мне сёння сніліся галасы дзевачак… Ой, як дзевачкі красіва пяюць!» Для «Калыханкі» Ананчыцы – гэта эстэтычны і чалавечы ідэал. Нейкая «вялікая утопія» – Атлантыда, заселеная і напоўненая зусім не па тых законах, па якіх поўніцца жыццё. У сучасным жыцці дзеці – найперш, дзеці сваіх бацькоў. А ў Ананчыцах дзеці, як і ўсе людзі, – божыя стварэнні. А гэта вялікая розніца і пачатак сапраўднай свабоды і адказнасці за ўсё. І я думаю, што менавіта такія пачуцці ахапілі Таццяну Мігаль (цяпер Шарамет) калі, вярнуўшыся з Слуцкіх дажынак, яна, у той час 12-ці гадовая дзяўчына, кінулася на ложак і загаласіла: «Хачу ў Ананчыцы!».

У фестывальных паездках ананчыцкія жанчыны заўсёды ўяўлялі сабою «амбасаду» вёскі Ананчыцы, сваю супольнасць, абмежаваную тэрытарыяльна. Яны імкнуліся максімальна эстэтызаваць прастору вакол сябе. Некуды хавалі свае клуначкі. Прыгожа кучкаю станавіліся, або садзіліся. Сачылі за сваімі хустачкамі, гузікамі, боцікамі. Яны ніколі не прасілі «не ў пару» есці, піць, ім не было холадна, млосна, не ўтульна. І як людзі, якія шмат у жыцці бачылі, заўсёды былі гатовыя сустрэць любую нечаканасць, перашкоду, альбо па першай просьбе заспяваць (станчыць, расказаць нешта смешнае). Яны памяталі ўсіх, з кім пазнаёміліся ў паездках, распытвалі потым пра гэтых людзей, як іх здароўе, як дзеткі і родныя. Пісалі ім лісты і адказвалі на паштоўкі. У паездках арганізатараў і гасцей фестываляў частавалі семкамі, салам, маслам, тварагом, імкнуліся ўсіх сабраць за свой «амбасадны» ананчыцкі стол. Такія традыцыі ўсталявала стваральніца Вольга Паўлаўна Пажыган, а зараз працягвае кіраўнік ансамбля і дырэктар Ананчыцкага дома культуры Вольга Дзянісаўна Страленя.

Нельга сказаць, што выхаванцы «Калыханкі» пасля сустрэч з ананчыцкім гуртом імгненна мяняліся. Але я бачу, што ў дарослым жыцці яны не супрацьстаяць каштоўнасцям, набытым у Ананчыцах. Яны стрымана, «не эпатажна» апранаюцца, жывуць у сем'ях разумна і цярпліва. Першыя ўдзельніцы «Калыханкі» зараз, як і раней, любяць народную песню і свой вышываны крыжыкам касцюм з саматканага ільну.

Спіс літаратуры:

1. Черковская, В. Спелись бабушки и внучки / В. Черковская // Шахтёр. – 2001. – № 99, дек. – С. 1.
2. Рыжкова, Л. Устная форма обучения традиционному народному пению в детском фольклорном ансамбле (из опыта работы фольклорного ансамбля «Колыханка») / Л. Рыжкова // Механизм передачи фольклорной традиции. – СПб. : Рос. ин-т истории искусств, 2004. – С. 280–286.
3. Вострыкаў, В. Зноў на экране ананчыцкія спявачкі / В. Вострыкаў // Шахцёр. – 1994. – № 68, ліст. – С.1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ